11. Дело о передаче Гвозницкой церкви Брестского повета и имущества католическому духовенству 1925-1931 гг. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. 1. – Д. 3142.
12. Дело о снятии с работы и исключении из духовного ведомства священника Бачинского Петра 1930-1932 гг. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. – 2. – Д. 448.
13. Там же. – Д. 448.
14. Переписка с церковнослужителями о приеме на работу и увольнении, состояние благочиннических округов, покупке церковного инвентаря, переводе священников в другие приходы и отчеты о состоянии церквей и борьбе с униатской пропагандой 1930-1932 гг. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. – 2. – Д. 547. – Л. 410-411.
15. Дело об униатском движении и ремонте церкви в Замшанах Брестского повета 1928-1930 гг. // ГАБО. – Ф. 1. – Оп. 2. – Д. 2342.
16. Клировые ведомости церквей 4 округа Брестского повета за 1927 г. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. – 4. – Д. 19.
17. Дело об униатском движении и ремонте церкви в Замшанах Брестского повета 1928-1930 гг. // ГАБО. – Ф. 1. – Оп. 2. – Д. 2342.
18. Клировые ведомости церквей 4 округа Брестского повета за 1924 г. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. – 4. – Д. 17.
19. Личное дело Городовского Стефана 1923-1927 гг. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. – 2. – Д. 60.
20. Дело о расследовании прошения прихожан Малоритской церкви Брестского повета о захвате гминным управлением здания бывшей церковно-приходской школы в местечке Малорита 1926 г. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. 1. – Д. 3151.
21. Отчеты поветовых старост и сведения о настроениях православного населения в связи с закрытием католическим духовенством православных церквей, занятии их земель и о деятельности религиозных сект 16 января 1929 -23 ноября 1929 гг. // ГАБО. – Ф. 1. – Оп. 10. – Д. 2307.
22. Списки священников за 1933 г. // ГАБО. – Ф. 2059. – Оп. 2. – Д. 516.
23. Мельничук, В. Миссионерская деятельность Православной Церкви в Польше в межвоенный период (по материалам Полесской и Волынской епархий): дипломная работа / В. Мельничук. – Жировичи, 1999.
24. Воскресное чтение. – 1939. – № 2.

## ТАТАРСКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАДЗЕ II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1921-1939 гг.)

**Грыбава С.У.**
ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта»

Татарская супольнасць Беларусі ў выніку гістарычных працэсаў (на падставе Рыжскага мірнага дагавору ад 18 сакавіка 1921 г. і Акту ўз'яднання Віленскага края з Рэспублікай Польшча, які прыняў Устаноўчы сход у Варшаве 22 сакавіка 1922 г.) размяшчалася ў складзе розных дзяржаў, а менавіта: II Рэчы Паспалітай і БССР. Дадзены артыкул прысвечаны нацыянальна-культурнаму развіццю татарскіх абшчын, якія апынуліся на тэрыторыі Польскай дзяржавы. Іх становішча ў значнай ступені вызначалася дзяржаўнай палітыкай II Рэчы Паспалітай у дачыненні да татарскай меншасці.

Гістарычна склалася такім чынам, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая да 17 верасня 1939 г. знаходзілася ў складзе Польшчы, размяшчалася большая частка татарскіх абшчын раз'яднаных беларускіх зямель. Палітыка польскіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцяў краіны была вельмі неадназначнай. Аднак, трэба заўважыць, што татарскае насельніцтва ў значна меншай ступені адчула ее несбалансаванасць. Дарэчы, у свой час у якасці бліжэйшых супрацоўнікаў Ю.Пілсудскага па яго сацыялістычнай дзейнасці былі два татарыны: Аляксандр Сулькевіч (1867-1916 гг.) і Стэфан Беляк (1868-1907 гг.). Былі яны ўдзельнікамі I з'езда Польскай партыі сацыялістычнай (ППС), калі былі пакладзены асновы яе дзейнасці. А падчас III з'езда партыі, у склад трохасабовага цэнтральнага рабочага камітэту, які кіраваў працай партыі, разам з Пілсудскім і Вайцэхоўскім, уваходзіў Сулькевіч [1, s.43].

Палітыка польскіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцяў грунтавалася на шэрагу заканадаўчых актаў і міжнародных пагадненняў. У першую чаргу гэта быў трактат аб нацыянальных і рэлігійных меншасцях, так званая малая Версальская дамова, падпісаная 28 чэрвеня 1919 г., якая лічылася адным цэлым з мірнай дамовай і была абавязковай для ўсіх падпісаўшых яе дзяржаў. Трактат гарантаваў усім грамадзянам II Рэчы Паспалітай, незалежна ад расы, мовы, веравызнання, роўнасць перад законам і магчымасць карыстацца грамадзянскімі і палітычнымі правамі. Трактатам прадуглежвалася, што з боку дзяржавы не будзе чыніцца ніякіх абмежаванняў у арганізацыі рэлігійнай практыкі любога вызнання, ва ўжыванні няпольскай мовы ў прыватных, гандлевых і рэлігійных зносінах, у прэсе, судах і грамадскіх акцыях, у рабоце асветных, дабрачынных і рэлігійных арганізацый. Польскі ўрад павінен быў забяспечыць грамадзянам з няпольскай роднай мовай, якія складалі значную групу насельніцтва дадзенага горада ці раёна, пачатковае навучанне іх дзяцей на роднай мове. Таксама у такіх рэгіёнах урад павінен быў забяспечыць меншасцям выдзяленне фінансавых сродкаў з дзяржаўнага і мясцовага бюджэту на выхаваўчыя, рэлігійныя і дабрачынныя мэты. Гарантам выканання прынцыповых пастаноў трактата была Ліга Нацый. У артыкуле 1 малога версальскага трактата Польшча давала гарантыю, што ніводзін закон, ніводнае распараджэнне або дзеянне дзяржаўнай адміністрацыі не будзе пярэчыць палажэнням трактата. Гэтыя палажэнні ў асноўным былі адлюстраваны у Канстытуцыі Польшчы ад 17 сакавіка 1921 г. і прадубляваны ў Канстытуцыі 1935 г. [2, с.27-28].

Безумоўна, дэмакратычнай палітыку Польшчы ў дачыненні да нацыянальных супольнас-цяў на яе тэрыторыі назваць нельга, аднак, што датычыцца татарскага насельніцтва краіны, то можна вызначыць адпаведныя станоўчыя яе накірункі.

У пачатку 20-х гадоў XX ст. паўстала пытанне аб аднаўленні спрадвечнай традыцыі татар – вайсковай службы ў межах татарскага ваеннага фарміравання. З дадзенай прапановай звярнуліся да Пілсудскага татарскія дзеячы на чале з Аляксандрам Ахматовічам, на што атрымалі станоўчы адказ. Спачатку была створана татарская конніца (кавалерыя), якая 3 лютага 1920 г. была пераўтворана ў Татарскі полк уланаў імя Мустафы Ахматовіча, які ўзначаліў татарын – генерал Аляксандр Рамановіч [1, s. 43]. Праз некаторы час, як лічаць даследчыкі памылкова, полк быў расфарміранаваны. Таму хутка было прынята рашэнне аб далучэнні ў Запасны эскадрон 13 палка віленскіх уланаў 180 салдат былой татарскай кавалерыі. Пазней татары дзейнічалі ў складзе 1 эскадрону 13 палка віленскіх уланаў. Але ідэя стварэння асобнага татарскага ваеннага фарміравання ў межах Польскіх узброеных сіл не пакідала актыўных татарскіх дзеячаў. Намаганні былых ваенных, а таксама членаў Культурна-асветніцкага саюза татар далі станоўчыя вынікі. Міністэрства ваенных спраў Рэчы Паспалітай вясной 1936 г. прыняло рашэнне аб

перайменаванні 1 эскадрона 13 палка віленскіх уланаў на 1 татарскі эскадрон. З гэтага часу ў дадзеным эскадроне неслі вайсковую службу ўсе прызваныя ў армію мусульмане. Аднак там былі і праваслаўныя, і каталікі, таму што мусульмане не маглі запоўніць цэлы эскадрон з-за сваей нешматлікасці, бо кожны год прызывалася ў армію толькі 20 татар [3, с.436-438]. Напярэдадні і падчас II Сусветнай вайны эскадрон узначальваў ротмістр Алі Ельяшэвіч. У верасні 1939 г. у эскадроне налічвалася 50 мусульман [4, с. 125].

Калі ва ўсходняй частцы Беларусі вялася барацьба з усімі рэлігіямі, то ў заходніх рэгіёнах ішоў працэс адраджэння ісламу. У межах Польскай дзяржавы налічвалася каля 6 тысяч татар-мусульман (па дадзеных мусульманскага календара, на 1 студзеня 1938 г. у Польшчы пражывала 6006 мусульман, з іх 2967 мужчын, 3039 жанчын) [5, с. 21]. З іх 197 чалавек жылі ў Варшаве, а для астатніх месцам жыхарства былі этнічныя беларускія землі [3, с. 405]. На тэрыторыі РП у снежні 1936 г. дзейнічала 19 рэлігійных абшчын, а менавіта ў Вільні, Немежы, Сорак-Татарах, Даўбуцішках, Іўі, Відзах, Докшыцах, Мядзелі, Навагрудку, Лоўчыцах, Слоніме, Некрашунцах, Клецку, Ляхавічах, Асмолаве, Міры, Багоніках, Крушынянах і Варшаве. Найбольш буйнымі былі абшчыны: у г. Навагрудку, дзе ў канцы 30-х гадоў XX ст. жыло 766 татар, у Відзах – 760 татар, у Іўі (Мураўшчызне) – 478 татар, у Докшыцах – 460, у Слоніме 413 прадстаўнікоў татарскай меншасці (што дарэчы, складала 2 % ад насельніцтва горада) [6, с. 234; 7, с. 214; 8, с. 250].

На падставе дзяржаўнага заканадаўства, а менавіта артыкулаў 110-113 і 120 сакавіцкай Канстытуцыі 1921 г., якія датычылі ўсіх веравызнанняў, у краіне абвяшчалася свабода сумлення, свабода арганізацый публічных набажэнстваў і сходаў, магчымасць уласнасці і свабоднага распарджэння цэрквамі маемасцю, дазвалялася навучанне рэлігіі ў школах і інш. [2, с. 69]. Так, дзякуючы сродкам, якія былі выдзелены Міністэрствам па справах веравызнання і грамадскай асветы, а таксама некаторым замежным крыніцам фінансавання, былі адбудаваны разбураныя ці спаленыя ў ваенных віхурах пачатку XX ст. мячэці ў Клецку, Некрашунцах, Мядзелі. У 1928 г. пачала дзейнічаць мячэць у Ляхавічах, у 1934 – у Відзах. Значна была перабудавана і адрамантавана мячэць у Іўі. У 1920-х г. тут быў дабудаваны мінарэт і агароджаны мізар (могілкі). У 1928 г. мячэць XVIII ст. у Даўбуцішках была прызнана гістарычнай каштоўнасцю і ўзята пад апеку. Увогуле, на тэрыторыі Польскай дзяржавы дзейнічала 17 мячэцяў і 3 малітоўных дамы (здзяйснялі набажэнства 19 мулаў, 23 муэдзіны (намеснікі мулаў) [3, с. 418-419; 8, с.248]. Штогод на падтрымку татар-мусульман (аплата працы мулаў, рамонт і будаўніцтва мячэцей) польская дзяржава выдаткоўвала адпаведныя сродкі. У 1927 г. гэта сума складала 63 тыс. злотых, у 1929 г. – 65 тыс. злотых, з 1931 – 57 тысяч злотых [9, s. 150]. Есць звесткі аб тым, што мулы ў розных месцах, у залежнасці ад велічыні абшчыны, атрымлівалі ад дзяржавы ад 40 да 100 злотых у месяц, а муэдзіны – ад 20 да 30 злотых [10, с. 153].

Выхаванню павагі да сваіх продкаў, каранёў служыла традыцыя штогод вясной і ў пачатку лета наведваць татарскія мізары (могілкі) – так званы абрад «зірэць». У 1938 г. толькі на тэрыторыі трох ваяводстваў – Віленскага, Навагрудскага і Беластоцкага – знаходзілася 68 мізароў [7, с. 215]. «Мусульманскі каляндар» за 1939 г. падае лічбу 71 мізар. Найбольшая іх колькасць, 47 мізароў, знаходзілася на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства [11, с.39].

Палепшыліся ўмовы традыцыйнай адукацыі татар-мусульман. Школы чытання Кур'ана – мектэбэ, знаходзіліся ў кожным татарскім паселішчы. У вялікіх абшчынах школы размяшчаліся ў спецыяльных будынках, дзе годжый (настаўнік) праводзіў заняткі па спецыяльна распрацаванай праграме. Напрыклад, у Навагрудку драўляны будынак школы знаходзіўся побач з мячэццю. У Іўі будынак школы быў узведзены за грошы, якія даслалі

у 1922 г. іх супляменнікі з Амерыкі (граф Томаш Замойскі, з роду былых уладальнікаў Іўя) [3, с. 418]. Для атрымання мусульманскай адукацыі на больш высокім узроўні дзяцей накіроўвалі ў Югаславію, Боснію, дзе яны навучаліся ў медрэсэ – сярэдняй навучальнай установе, якая давала не толькі рэлігійную, але і агульную сярэднюю адукацыю. А найбольш здольныя вучні пасля гэтага мелі магчымасць навучацца нават у мусульманскіх вышэйшых навучальных установах у арабскіх краінах [12, с. 11-12].

На падставе дзяржаўнага заканадаўства, 28-29 снежня 1925 г. у Вільні адбыўся Усяпольскі з'езд дэлегатаў мусульманскіх абшчын, які заснаваў муфціят Рэчы Паспалітай. Выбар месца правядзення падкрэсліваў значэнне горада як цэнтра татарскага асадніцтва XIV-XV стст. Адкрываючы з'езд, віленскі ваявода А. Маліноўскі ад імя польскага ўрада сказаў дэлегатам: «Звяртаючыся да вас як нашчадкаў старадаўніх татар, якія зберaглі веру сваіх продкаў, а праз гэта і сваю расавую самабытнасць, – маю ўсе падставы сцвярджаць, што адносіны Рэчы Паспалітай да грамадзян мусульманскай веры будуць напоўнены такой жа добразычлівасцю і добрай воляй, якой вызначаліся ў гістарычным мінулым у ходзе нашай агульнай гісторыі» [7, с. 214].

На з'ездзе было зацверджана ўзнікшае некалькі раней грамадска-культурнае аб'яднанне, якому была нададзена назва "Культурна-асветніцкі Саюз татар Рэчы Паспалітай" (КАСТРП). Цэнтральную Раду Саюза ўзначаліў Альгерд Найман-Мірза Крычынскі. У склад Рады ўваходзілі таксама Я. Багдановіч, Я. Якубоўскі, Д. Яновіч-Чаінскі, С. Мурза-Мурзіч (сакратар), Ш. Шайкевіч, А. Шчуцкі [8, с. 253].

Выбраны на з'ездзе муфцій – Якуб Шынкевіч, пачаў выконваць свае функцыі ў наступным годзе. Яго намеснікам стаў Якуб Рамановіч. Іх дзейнасць была падтрымана ўладамі дзяржавы, хаця юрыдычнае абаснаванне яна атрымала толькі 21 красавіка 1936 г., калі быў прыняты закон «аб стаўленні дзяржавы да Мусульманскага рэлігійнага Саюза ў Польшчы». У распрацоўцы закона, а таксама Статута Мусульманскага рэлігійнага Саюза муфціят супрацоўнічаў з міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы. Статут быў зацверджаны польскім урадам 26 жніўня 1936 г. [13, s. 4] На падставе Статута, муфцію даручаліся выключна рэлігійныя справы, у тым ліку, тыя, якія датычыліся інтэрпрытацыі Курана і Шарыята, рэлігійнай практыкі. Муфцій здзяйсняў агульнае кіраўніцтва рэлігійным Саюзам і прадстаўляў яго перад дзяржаўнай уладай, уладамі іншых цэркваў і рэлігійных саюзаў, а таксама перад мусульманскімі рэлігійнымі саюзамі за мяжой. Ен таксама назіраў за дзейнасцю імамаў, кіраваў уладаннямі рэлігійнага Саюза, а таксама ўзначальваў Мусульманскую Калегію Усяпольскага Мусульманскага Кангрэса. Свае паўнамоцтвы муфцій здзяйсняў пажыццёва. Вырашэнне важнейшых рэлігійных спраў Статут даручаў Мусульманскай Вярхоўнай калегіі, якая стваралася пры муфціяце.

Дзеля аблягчэння кантактаў муфція з мусульманскім светам Міністэрства замежных спраў стварыла яму ўмовы для трох паездак на Блізкі Ўсход і адной у Індыю [3, с. 414-415].

Аднак трэба адзначыць, што выпрацоўка Статута не была лёгкай справай. Да яго прыняцця сярод татарскай інтэлігенцыі адбыўся канфлікт наконт паўнамоцтваў муфція і прававога статуса муфціята, які, з пункту гледжання часткі членаў Культурна-асветніцкага Саюза татар, імкнуўся быць адзіным прадстаўніком татарскай меншасці ў Польшчы [14, s. 13]. Канфлікт быў заўважаны ўладамі Польскай Рэспублікі. Па даручэнню міністра веравызнанняў і грамадскай асветы ў Вільні былі праведзены сустрэчы з прадстаўнікамі татарскай грамадскасці, якія садзейнічалі дасягненню кампрамісу паміж муфціям і часткай татарскай інтэлігенцыі. Канфлікт канчаткова быў скончаны на І Усяпольскім Мусульманскм Кангрэсе 31 студзеня 1938 г. у Вільні, калі была выбрана Вярхоўная Мусульманская Калегія, якая, згодна са Статутам, стала дапаможным органам пры муфціяце [3, с. 417].

Станоўчая палітыка ўладаў у дачыненні да татарскага насельніцтва Польшчы дазволіла татарскай інтэлігенцыі арганізаваць грамадска-культурную працу. Культурна-асветніцкі саюз татар Рэчы Паспалітай пачаў выдаваць друкаваныя органы: з 1934 г. штомесячнік «Татарскае жыцце», «Ісламскі агляд», «Татарскі штогоднік» (1932 г., 1935 г., 1938 г.). Рэдактарам апошняга быў адзін з актыўных дзеячаў КАСТРП Леон Найман Мірза Крычынскі. Артыкулы ў згаданых выданнях былі прысвечаны гісторыі татарскага этнасу, стану ісламскай рэлігіі ў РП і мусульманскіх краінах, друкаваліся навіны грамадска-рэлігійнага жыцця татарскай дыяспары. Дадзеныя часопісы выходзілі на польскай мове, трэба адзначыць, што татарскай мясцовыя мусульмане не валодалі з XVI ст. Часопіс «Татарскі штогоднік» уяўляў сабой выданне навуковага характару, дзе друкаваліся аўтары з ліку як татарскай інтэлігенцыі, так і прадстаўнікоў польскай гістарычнай навукі. Сярод іх: Альгерд Крычынскі, Станіслаў Крычынскі, Алі Вархановіч, Ананіаш Заянчкоўскі і інш. Дарэчы, міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы, а таксама польскі Фонд народнай культуры аказвалі фінансавую падтрымку КАСТРП для выдання «Татарскага штогодніка». Усяго ў міжваеннай Польшчы было надрукавана каля 500 прац (найперш артыкулаў), прысвечаных гісторыі і культуры татараў [8, с. 256]. Дзейнічалі ў Вільні татарскія музей і архіў, асноўным арганізатарам якіх быў Леон Крычынскі. У 1932 г. у музеі захоўвалася больш 50 каштоўных помнікаў: рукапісныя караны, кітабы, хамаілы, збор дакументаў з татарскімі пячаткамі, куфічныя манеты, старадрукі, дакументы з подпісам караля Рэчы Паспалітай С. Панятоўскага, малюнкі і фотаздымкі мячэцяў і інш. Пасля пераезду захавальніка Л. Крычынскага ў Замосце музейныя і архіўныя матэрыялы размяшчаліся ў сховішчах муфціяту [8, с. 255].

Акрамя ўжо адзначаных актывістаў нацыянальна-культурнага развіцця татарскай дыяспары можна таксама назваць наступныя прозвішчы студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў: Александровіч Адам (Клецк), брат і сястра Якубоўскія – Амурат і Ева (Клецк). Рамуальд Сабалеўскі (Іванава), Алі Шэгідзевіч (Баранавічы) і многія іншыя [15, с.4-5]. Дзеля распаўсюджаня асветы КАСТРП імкнуўся стварыць свае аддзелы нават у зусім нявялікіх і аддаленых татарскіх паселішчах. Да 1930 г. іх налічвалася 21, у тым ліку ў Навагрудку, Мураўшчызне (Іўі), Асмолаве, Клецку, Ляхавічах, Крушынянах, Мядзелі, Відзах і інш. [16, s. 12] Добра служыла наладжванню справы адукацыі мусульман рэлігійная абшчына Слоніма. Тут якасна была пастаўлена работа сярод дзяцей. А ў 1927 г. па ініцыятыве членаў створанага аддзела Культурна-асветніцкага саюза татараў, стала дзейнічаць бібліятэка, якая вяла сваю працу да верасня 1939 г. [17, с. 31].

Па ініцыятыве татарскіх дзеячаў у 1933 г. у Навагрудку і Слоніме, а ў 1937 г. у Клецку, былі створаны з ліку татарскай моладзі асобныя аддзелы Стралецкага Саюза – польскай ваенізаванай грамадскай арганізацыі. Пры татарскіх аддзелах працавалі драматычныя секцыі, ставіліся тэатральныя пастаноўкі, спевы на татарскай і польскай мовах, выконваліся танцы ў нацыянальных касцюмах. Спектаклі выклікалі цікавасць у татарскага насельніцтва, асабліва моладзі. Прыбытак ад тэатральных забаў у Слоніме выкарыстоўваўся для культурна-асветніцкіх патрэб, папаўнення бібліятэкі. 27-29 жніўня 1936 г. татарскі аддзел Стралецкага саюза ў Навагрудку арганізаваў велізарнае спатканне (фэст) для татарскай моладзі з розных мясцовасцей. Дзеячы КАСТРП у 1937 г. арганізавалі правядзенне рамесніцкіх курсаў для гарбароў, у пачатку 1939 г. – Клецку [8, с. 257-258].

Аднак не трэба ідэалізаваць узровень нацыянальнай самасвядомасці татарскага насельніцтва Польшчы. Жывучы ў хрысціянскім асяродку, працэсаў апалячвання (у дадзеным выпадку) было пазбегнуць вельмі складана. Трэба таксама адзначыць, што ў

гістарыяграфіі існуе праблемнае пытанне, звязанае з вызначэннем татарскай дыяспары як нацыянальнай меншасці ці этнічнай (этнаграфічнай) групы [3, 8]. З нашага пункту гледжання, прадстаўнікі татарскага насельніцтва, пад уздзеяннем палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, былі лаяльнымі грамадзянамі Польскай дзяржавы, аднак захоўвалі свае нацыянальныя адметнасці.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што палітыка «праметэізму», якую праводзіла польская дзяржава асабліва актыўна з 1926 г., і мела на мэце нейтралізаваць СССР як моцнага суседа, шляхам расчлянення яго на асобныя дзяржаўныя ўтварэнні з нярускіх народаў, у тым ліку, безумоўна, і татарска-мусульманскіх, пад пратэктаратам Польшчы, адбівалася і на польскіх татарах [18, s. 15; 19, c. 453-457]. Дадзеную мэту польская дзяржава здзяйсняла, супрацоўнічаючы з прадстаўнікамі палітычнай эміграцыі з Савецкай Расіі на Захадзе. А менавіта у 1926 г. у Парыжы была створана арганізацыя "Праметэўш", а ў 1926 г. у Варшаве, у якасці філіялу, клуб "Праметэўш", куды ўваходзілі прадстаўнікі ўкраінскай, грузінскай, азербайджанскай, туркменскай, паўночна-каўказскай эміграцыі, а таксама татары Крыма і Ідэль-Урала. Арганізацыя мела антысавецкі характар і ставіла сваей мэтай абарону правоў народаў Каўказа і Украіны, а пазней памкненняў да незалежнасці і астатніх нярускіх народаў СССР. У ІІ РП у накірунку рэалізацыі палітыкі "праметэізму" дзейнічалі дзяржаўныя інстытуты, сярод іх: Экспазітура № 2 ІІ Аддзелу Генеральнага Штабу польскага войска, якая падзялялася на шэраг аддзелаў, у тым ліку Аддзел Б ці самастойны сектар «Усход» [20, s. 44, 50-51]. У яго кампетэнцыі была і тайная апека над дзейнасцю Культурна-асветніцкага Саюзу татар РП, некаторыя ініцыятывы і дзеячы якога тайна ім фінансаваліся. Створаны ў Варшаве Інстытут Усходні, як навуковы і палітычны орган «праметэізму», прадстаўляў свае памяшканні дзеля здзяйснення рэлігійных культаў мусульманскай гміне ў Варшаве, дзе на набажэнствах маглі прысутнічаць, акрамя польскіх, крымскія, казанскія мусульмане і іншыя прадстаўнікі ісламскага свету. Наладжванню кантактаў польскіх татар з «праметэйскай» эміграцыяй у Польшчы спрыялі і арганізаваныя Інстытутам лекцыі, таварысцкія спадканні, вечарыны. Такога кшталту тэндэнцыі мелі месца і ў Вільні, дзе навуковым цэнтрам «праметэізму» быў Інтытут даследаваняў Еўропы Усходняй. Некаторыя даследчыкі лічаць, што дадзеныя акалічнасці спрыялі развіццю ў асяродку польскай татарскай эліты ідэалогіі панісламізму, пантуркізму і татарскага нацыяналізму (пад кантролем польскай дзяржавы) [19, с. 461]. Да рэчы, у якасці друкаваных органаў «праметэізму» адзначаюцца з 1936 г., а асабліва ў 1937-1939 гг., галоўным цэнтрам прапаганды дадзенай ідэалогіі было Кола татарскай моладзі (КТМ) у Вільні (з 1937 г. – Цэнтральная Рада гурткоў татарскай моладзі РП, у склад якой уваходзіла 7 чалавек). [21, s. 19]. Гэтую арганізацыю ўзначальваў Эдыгей Шынкевіч. Функцыі яго намесніка выконваў Алі Смайкевіч. У адозвах КТМ, аўтарамі якіх былі яго вызначаныя лідэры, ідзе размова аб Крыме і Ідэль-Урале як аб «краях, блізкіх нашаму сэрцу» [19, с.453]. Дарэчы, згаданая ідэалогія прапагандавалася на старонках часопісаў "Жыцце татарскае" і "Ісламскі агляд", якія выдаваліся КАСТРП і фінансаваліся дзяржаўнымі органамі [19, с. 461; 20, s. 140-141].

Можна меркаваць, што становучая палітыка польскіх улад у адносінах да татар (у параўнанні з іншымі нацыянальнымі меншасцямі Рэчы Паспалітай: беларусамі, украінцамі, літоўцамі, якія прагнулі да сваіх дзяржаў) была абумоўлена тым, што татары не прытрымліваліся сепарацыйных памкненняў і не ўяўлялі ніякай самастойнай палітычнай сілы, што магло б выклікаць адмоўную рэакцыю польскіх улад. За ўвесь час не было заснавана ні

адзінай татарскай нацыянальнай палітычнай партыі, а створаны татарскі выбарчы камітэт ухіляўся ад уласнага ўдзелу ў выбарах у польскі сейм, сенат і падтрымліваў Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам [8, с. 256]. Прадстаўнікі польскіх татар не мелі ніякіх праблем з нацыянальнымі палітычнымі інстытутамі II РП, а «Варшаўская газета» – галоўны орган Нацыянальнай Дэмакратыі друкаваў артыкулы аб польскіх татарах у пазітыўным ракурсе, падкрэсліваючы іх станоўчую службу на карысць польскай дзяржавы і ролю ў кантактах з ісламскім Усходам [19, с. 462].

Такім чынам, нават на падставе дадзенага невялікага агляду становішча татарскага насельніцтва ў складзе Польшчы (на тэрыторыі Заходняй Беларусі) напярэдадні ваенных падзей становіцца відавочным, што дзяржава стварала пэўныя ўмовы для ажыццяўлення нацыянальна-культурнага развіцця татарскай дыяспары. Гэта было карысна, па-першае, польскім уладам, чым яны дэманстравалі выкананне патрабаванняў Лігі Нацый, і з другога боку, самой татарскай інтэлігенцыі, якая такім чынам мела магчымасць ажыццяўляць грамадска-культурную і рэлігійную дзейнасць. Трэба таксама мець на ўвазе, што некаторыя прадстаўнікі польскай татарскай эліты актыўна падтрымлівалі захады Пілсудскага ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, што таксама спрыяла станоўчаму стаўленню ўлад да іх.

**Літаратура**

1. Kolodzejczyk, A. Jozef Pilsudski a polscy tatarzy / A. Kolodzejczyk // Zycie muzulmanskie. – 1989. – № 1-2. – S. 39-46.

2. Загідулін, А.М. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.): дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. М. Загідулін. – Гродна, 2005. – 130 л.

3. Миськевич, А. Татарское меньшинство в Польше в 1918-1939 гг. Общая характеристика, поселения, общественно-профессиональное состояние / А. Миськевич // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысв. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26-27 сак. 1993 г. / БДПУ, Беларускае згуртаванне татараў-мусульман "Аль-Кітаб"; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 3. – С. 403-449.

4. Александрович, Х. Татары Клецкого джамията в годы Второй мировой войны / Х. Александрович // Участие тюркских народов и народов Кавказа в ВОВ 1941-1945 гг.: материалы Х междунар. науч.-практ. конф. – Минск, 2-3 сентября 2004 г. / БГПУ, редкол.: Канапацкий И.Б. [и др.]. – Минск, 2004. – С. 124-149.

5. Криницкий, А. Некрашунская мечеть и ее парафия / А. Криницкий // Мечети и мизары татар Беларуси, Литвы и Польши. К 100-летию второй Минской мечети : материалы VIII междунар. науч.-практ. конф., Новогрудок 5 июля 2002 г. / Белорусское татарское общество "Зикр Уль Китаб" ; редкол.: И.Б. Канапацкий (отв. ред.) [ и др.]. – Новогрудок, 2003. – С. 19-21.

6. Miskiewicz, A. O tatarach polskich w Slonimie / A. Miskiewicz // Rocznik tatarow Polskich – 1994. – № 2. – C. 231-236.

7. Канфесіі на Беларусі / В.В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВГ "Экаперспектыва", 1998. – 215 с.

8. Вабішчэвіч, А. Нацыянальна-культурнае жыцце Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.) А. Вабішчэвіч. – Брэст: БрДУ, 2008. – 319 с.

9. Maly rocznik statystyczny: wrzesien 1939 - czerwiec 1941 – Warszawa: zakla wydawnictw statystycznych, 1990. – 160 s.

10. Крывашэй, Д.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 –ліпень 1944 г. ) / Д.А. Крывашэй. –Мінск: Беларуская навука – 2009. – 198 с.
11. Канапацкі, І. Складаныя пытанні захавання татарскай меншасці ў Рэспубліцы Беларусь / І. Канапацкі // Нацыянальныя меншасці Беларусі. Кн. 3 – Брэст – Мінск, 1996. – С. 36-40.
12. Канапацкі, І. З гісторыі мусульманскай адукацыі татарскай дыяспары на Беларусі / І. Канапацкі, А.-Б. Шабановіч // Нацыянальная адукацыя: тэматычны зборнік навуковых прац. Кніга IX. Адукацыя дыяспар. Навук. рэдактар С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1998. – С. 10-14.
13. Uregulowanie stanu prawnego wyznania muzulmanskiego w Polsce // Przeglad islamski. – 1936. – № 1-3. – S. 4.
14. O uregulowanie polozenia prawnego muzulmanskiego zwiazku religijnego w Polsce // Przeglad islamski. – 1934. – № 1. – S.13.
15. Александрович, Х. Вторая мировая война и ассимиляция белоруско-польских татар (к 60-летию окончания войны) / Х. Александрович // Жизнь. – 2005. – март. – С. 4-5.
16. Adresy oddzialow zwiazku kulturalno-oswiatowego tatar RP// Przeglad islamski. – 1930. – № 1. – s. 12.
17. Канапацкі, І. Адукацыя татар на Беларусі ў 1920-1930 гг. / І. Канапацкі. // Нацыянальная адукацыя. Кн. 7 – Брэст – Мінск, 1996. – С. 30-32.
18. Zbior dokumentow pplk. Edmunda Charaszkiewicza / Komitet Badan Naukowych; opracowanie A. Grywacz, M. Kwiecien, G. Mazur. – Krakow : Centrum dokumentacji czynu niepodleglosciowego, ksiegarnia Akademicka, 2000. – 185 s.
19. Chazbijewicz, S. Ewolucja ideologii polskich muzulmanow w latach 1934-1939 / Chazbijewicz S. // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысв. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26-27 сак. 1993 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т, Беларускае згуртаванне татараў-мусульман "Аль-Кітаб"; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – ч. 3. – С. 449-467.
20. Maj, I. Dzialalnosc Instytutu Wschodniego w Warszawie 1926-1939 / I.P Maj. – Warszawa: Instytut studiow politycznych PAN – 2007. – 291 s.
21. Chazbijewicz, S. Ideologie muzulmanow polskich w latach 1918-1939 / Chazbijewicz S. // Rocznik tatarow polskich. – 1993. – T. I. – S. 15-43.

## ВОЙСКОВАЯ ОПЕРАЦИЯ РККА 15 СЕНТЯБРЯ – 12 ОКТЯБРЯ 1939 ГОДА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

**Данилов Ю.Д.**
УО «Брестский государственный технический университет»

70 лет назад в Москве между СССР и Германией был подписан договор о ненападении, больше известный как пакт Молотова-Риббентропа. Впрочем, решающее значение имел не столько сам договор, сколько секретное приложение к нему, которое, по сути, перекроило карту Европы. О последствиях историки спорят до сих пор: стал ли он отправной точкой к началу Второй мировой войны, и сохранился бы мир, если бы не растоптали Польшу? Документ этот, по мнению одних историков, во многом способствовал началу Второй мировой войны, по мнению других – позволил отсрочить её начало. Кроме того,